Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Любанскі сельскагаспадарчы прафесіянальны ліцэй»

# Шлях узровень з векам

работа на конкурс эсэ,
прысвечаны 100-годдзю з дня ўтварэння
Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Аўтар Рудзько Аляксей Русланавіч,
навучэнец I курса
вучэбнай групы 400

Кіраўнік Якушэвіч Алена
Станіславаўна, выкладчык гісторыі

Любань
2018

Паважаны сябра, мой аднагодак! Напярэдадні 100-годдзя з дня ўтварэння БССР хацелася б паразважаць аб значэнні гэтай падзеі ў тваім і маім жыцці.

Я, як і ты, нарадзіўся ў Рэспубліцы Беларусь – суверэннай незалежнай дзяржаве. А вось жыццё майго дзядулі – так я называю свайго прадзеда Муравейку Івана Андрэевіча – непарыўна звязана з гісторыяй станаўлення і развіцця БССР, бо жыццё гэтае пачалося амаль адначасова са стварэннем маладой беларускай дзяржавы.

Дзядуля нарадзіўся 21 кастрычніка 1921 года ў вёсцы Таль Любанскага раёна ў звычайнай сялянскай сям’і. Ці маглі марыць яго малапісьменныя бацькі, што сын не толькі скончыць Тальскую сямігодку, але атрымае сярэднюю адукацыю, паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову?

Кастрычніцкая рэвалюцыя, утварэнне БССР адкрылі шырокія магчымасці для атрымання адукацыі дзецьмі з сем’яў рабочых і сялян. На момант заканчэння сямігодкі маім прадзедам у БССР ўжо дзейнічала адноўленая з 1932 года сістэма агульнай сярэдняй адукацыі, і ў 1939 годзе ён скончыў Любанскую сярэднюю школу.

Пасля атрымання сярэдняй адукацыі просты сялянскі хлопец Іван Муравейка падаўся ў сталіцу БССР – горад Мінск: ён марыў аб вышэйшай адукацыі. Створаная ў БССР сістэма вышэйшай адукацыі дазваляла абраць для сябе любімую справу, якая б вяла па жыцці. Нягледзячы на тое, што савецкая рэспубліка была яшчэ зусім маладой, ужо на той час вышэйшую адукацыю можна было атрымаць у 25 вышэйшых навучальных установах Беларусі.

А ці ведаеш ты, мой дружа, колькі вышэйшых навучальных устаноў працуюць сёння ў нашай краіне? Ужо 51, а яшчэ 226 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 182 – прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.

Рэспубліка Беларусь захавала лепшыя традыцыі і заваёвы БССР у развіцці адукацыі. Сёння кожны можа задаволіць свае адукацыйныя патрэбы, знайсці сябе ў любімай справе, у прафесіі. Я вучуся ў Любанскім

сельскагаспадарчым прафесіянальным ліцэі. Мая будучыня звязана з прафесіяй механізатара. Якая высакародная справа і пачэсны абавязак – працаваць на зямлі, быць хлебаробам!

А майго дзядулю з самага дзяцінства вабіла паэзія. Першы верш Івана Муравейкі «Зіма» быў надрукаваны ў газеце «Піянер Беларусі» ў 1936 годзе. Дзіўна, якія трапяткія і пранікнёныя словы знайшоў хлапчук, мой аднагодак, каб перадаць прыгажосць і непаўторнасць зімовага дня! І далей па жыцці майго дзядулю вялі цікавасць і павага да роднага слова, якія выплёскваліся на паперу паэтычнымі радкамі. Таму выбар прадзеда і яго паступленне ў Мінскі камуністычны інстытут журналістыкі мяне нікольні не здзіўляе. Яму вельмі хацелася вучыцца, займацца літаратурнай дзейнасцю. Але ўсім спадзяванням і планам перашкодзіла вайна...

У мірнае жыццё БССР вайна ўварвалася налётамі фашысцкай авіяцыі, жудаснымі выбухамі, жаночым стогнам і енкам. У кровапралітных абарончых баях на тэрыторыі БССР пачынаўся баявы шлях майго дзядулі ў Вялікай Айчыннай вайне. Радавы 128 стралковай дывізіі Заходняга фронту Іван Муравейка быў цяжка паранены ў жніўні 1941 года. Пасля шпіталю і да самага канца вайны ён быў у дзеючай арміі. Інакш ён і не мог, калі родная зямля стагнала пад фашысцкай акупацыяй, калі баі разгарнуліся на агромністай тэрыторыі Савецкага Саюза ад Баранцава да Чорнага мора. Атрымаўшы званне малодшага лейтэнанта, у 1942 годзе Іван Муравейка стаў камандзірам мінамётнага ўзвода. З 1944 года ён быў карэспандэнтам газеты «Красный воин», потым літсупрацоўнікам дывізіённай газеты «Наступление». Сталінградская бітва, фарсіраванне Дняпра, Днястра, Віслы, Одэра – гэта яго дарогі вайны. На кожнай з вогненных дарог – цяжкія выпрабаванні, непапраўныя страты, непахісная вера ў Вялікую Перамогу.

Я ганаруся, што мой прадзед, мужна гледзячы ў вочы смерці, не скарыўшы сваёй галавы, праз усю вайну з вялікай годнасцю пранёс святую веру ў мірны заўтрашні дзень, дайшоў да самага Берліна. І ведайце ўсе! Гэта ён аставіў на сцяне рэйхстага свой аўтограф

«Іван з Беларусі». Колькі было іх, Іванаў, якія абаранялі сваю зямлю, выратавалі свет ад фашысцкай навалы! Колькі іх не дайшло да Берліна, не вярнулася да беларускіх спаленых вёсак і разбураных гарадоў?.. За іх за ўсіх на рэйхстагу застаўся надпіс «Іван з Беларусі».

Іван Андрэевіч Муравейка ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

А пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны пачалося мірнае жыццё. Старшы лейтэнант Іван Муравейка вярнуўся на Любаншчыну, бо не ўяўляў свайго жыцця без роднай старонкі, а яшчэ – без літаратурнай дзейнасці. Больш за 35 гадоў ён працаваў у рэдакцыі раённай газеты: адказным сакратаром, намеснікам рэдактара, рэдактарам. І ўвесь час мой дзядуля пісаў. Ён прынёс з вайны вялікае жаданне ў словах пакінуць нашчадкам памяць аб сваёй абпаленай полымем ваеннага ліхалецця маладосці. У яго сэрцы жыў боль аб загінуўшых таварышах. Незагойнымі ранамі ў душы адзываліся пакуты роднай зямлі, бязлітасна знявечанай фашысцкімі зверствамі. Тэме вайны прысвечаны яго зборнікі «Прынёс з вайны», «Была вайна», «Я – Іван з Беларусі». Але сапраўднае сваё прызванне паэт знайшоў у дзіцячай літаратуры, у вершах і казках для самых маленькіх грамадзян БССР, а зараз і Рэспублікі Беларусь.

Толькі такая багатая і шчодрая зямля магла даць свету высакародных, трывалых духам людзей, якія, пакінуўшы зброю, узялі ў рукі аловак і знайшлі самыя добрыя і пяшчотныя словы, каб данесці да маленькіх векавую мудрасць беларусаў. Толькі ў агульнай гісторыі са сваім народам і сваёй дзяржавай, якой бы складанай гэта гісторыя ні была, знаходзілі гэтыя людзі сілы для стваральнай працы, натхненне і плён для творчасці.

Я і мае аднагодкі маюць шчасце жыць у мірнай краіне, незалежнасць якой адваяваў мой прадзед і яго пакаленне. Ад іх нам дадзены запавет – захоўваць мір, самаахвярна працаваць у імя росквіту роднай Беларусі.